Т.А. Бембель,
старшы выкладчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Практычныя аспекты павышэння кваліфікацыі спецыялістаў культуры па напрамку «Сацыякультурнае праектаванне»

Сацыякультурнае праектаванне і асабліва праектная дзейнасць арганізацый культуры сёння з'яўляюцца важным трэндам развіцця нацыянальнай культуры. Аднак у працэсе азнаямлення з менеджментам культурнай дзейнасці па гэтым напрамку, што праводзіцца ўстановамі вышэйшай адукацыі, выяўлена, што яму ўдзяляецца няшмат увагі. І таму даследаванне аспектаў праектнай дзейнасці ў сферы культуры набывае асаблівую актуальнасць у сістэме ДАД сферы культуры.

У Інбелкульце пытанні сацыякультурнага менеджменту ў частцы праектнай дзейнасці сталі адным з найважнейшых змястоўных элементаў рэалізацыі адукацыйнага працэсу павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры. У першую чаргу гэта тычыцца такіх катэгорый слухачоў, як кіраўнікі, галоўныя спецыялісты, вядучыя спецыялісты, спецыялісты ўпраўленняў (аддзелаў) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, дырэктары, намеснікі дырэктараў абласных, гарадскіх, раённых культурна-асветных устаноў (метадычных цэнтраў, музеяў, бібліятэк, клубных устаноў), загадчыкі аддзелаў (сектараў) гарадскіх і раённых дамоў культуры, абласных, гарадскіх і раённых метадычных цэнтраў. Сярод адукацыйных праграм, якія рэалізуюцца ў Інбелкульце і ўключаюць у сябе праблемы сацыякультурнага праектавання, — «Сацыякультурны менеджмент і тэндэнцыі развіцця сферы вольнага часу», «Інструменты эфектыўнага кіравання арганізацыяй культуры», «Актуальныя кірункі дзейнасці культурна-асветных арганізацый», «Сацыяльна-культурнае праектаванне і асаблівасці фарміравання рэгіянальнай палітыкі ў сферы культуры» і інш.

На занятках па павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў культуры па напрамку «Сацыякультурнае праектаванне» ў Інбелкульце вельмі важнай з'яўляецца рэалізацыя практычных аспектаў. Іх можна падзяліць на дзве групы:

уласна методыка праектавання, заснаваная на разуменні спецыфікі праектнай дзейнасці і ведах аб тым, як стварыць канцэпцыю і забяспечыць іншыя складнікі, у тым ліку пошук фінансавання;

аналіз канкрэтных прыкладаў рэалізацыі канцэпцый з каментарыямі, тлумачэннямі і адсылкамі.

Метадалагічныя асновы праектавання з'яўляюцца дастаткова новай сферай адукацыйнай дзейнасці ў сістэме ДАД. Калі ў 1990-я гг. пры раскрыцці тэмы сацыякультурнага праектавання даводзілася грунтавацца выключна на асабістым вопыце стажыровак, а таксама прыкладах з замежнай практыкі ў літаратуры, не адаптаванай да нашых умоў, то ў апошняе дзесяцігоддзе з'явілася магчымасць выкарыстоўваць айчынныя дапаможнікі па розных аспектах праектавання. Практычныя кіраўніцтвы, падрыхтаваныя беларускімі экспертамі, дазваляюць карыстацца імі як на занятках,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

так і падчас самастойнай работы. Напрыклад, выданне «Логіка-структурны падыход і яго ўжыванне для аналізу і планавання дзейнасці» [1] адрасавана, перш за ўсё, кіраўнікам і супрацоўнікам органаў мясцовай улады, устаноў адукацыі і сацыяльнай сферы, а таксама грамадскіх арганізацый і ініцыятыў Рэспублікі Беларусь, якія выкарыстоўваюць або імкнуцца ўжываць у сваёй працы праектны падыход. Выданне «Мадэль IMACON: ацэнка задумы праектаў, маніторынг, арганізацыйнае развіццё» [2] выкарыстоўваецца кіраўнікамі арганізацый і менеджарамі праектаў у працэсе распрацоўкі канкурэнтаздольных заявак з высокай ступенню ўстойлівасці вынікаў да ўплываў вонкавага асяроддзя. Кніга «Інструментарый узмацнення жыццяздольнасці арганізацыі» [3] прапануе рэкамендацыі і метадалогію праз сферу экалогіі, але інструменты і метадалогія ў той ці іншай ступені могуць выкарыстоўвацца для ўмацавання жыццяздольнасці любой арганізацыі, якая абрала праектны фармат дзейнасці. З мэтай абагульнення вопыту па пэўных напрамках дзейнасці ў Інбелкульце таксама ствараюцца метадычныя дапаможнікі. Напрыклад, «Экспазіцыя ў музейнай прасторы: праектны менеджмент» (серыя «Музейны сшытак»), адрасаваны спецыялістам музейных устаноў, слухачам адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці» [4]. Прадстаўнікам дзяржаўных структур і арганізацый неабходна ведаць асноўныя прынцыпы праектнай дзейнасці для таго, каб узаемадзейнічаць з іншымі арганізацыямі ў сацыякультурнай сферы.

Распрацаваныя ў Інбелкульце вучэбныя праграмы па напрамку «Сацыякультурнае праектаванне» ўключаюць у сябе асноўныя метадалагічныя аспекты — гэта пытанні кіравання праектамі, спецыфікі гэтага віду дзейнасці ў сферы культуры, адаптацыі прынцыпаў менеджменту ў сферы культуры да ўмоў Беларусі, тэхналогій распрацоўкі і рэалізацыі культурных праектаў, тэхналогіі прыцягнення сродкаў замежных фондаў і праграм, рэалізацыі PR-тэхналогій у прасоўванні праектаў.

У сваёй большасці культурныя праекты ў Беларусі ажыццяўляюцца на базе музеяў, галерэй, бібліятэк, метадычных і адукацыйных цэнтраў, іншых устаноў адукацыі і культуры, дзе сетка падобных устаноў шырокая, у сталіцы і буйных гарадах краіны. У сувязі з гэтым асаблівую актуальнасць у адукацыйным працэсе павышэння кваліфікацыі ў Інбелкульце набывае тэма рэалізацыі культурных праектаў у рэгіёнах, навучання адпаведных спецыялістаў тэхналогіям.

За мінулыя гады назапашаны і практычны вопыт, і пэўныя назіранні, якія дазваляюць зрабіць высновы аб перспектыўнасці культурнага праекта ў фармаце ўзаемадзеяння суб’ектаў развіцця эканомікі тэрыторый у рэгіёнах. Акцэнт для слухачоў ставіцца на тым, што найважнейшым набыццём для рэгіёна ў выніку падобных акцый становіцца не толькі матэрыяльны вынік. У кожным канкрэтным выпадку адбываецца і выпрацоўка фармату ўзаемадзеяння суб’ектаў развіцця эканомікі тэрыторый у сацыякультурнай сферы. Культурны праект — гэта сапраўдная камунікатыўная пляцоўка.

У метадычным плане для ініцыятараў культурных рэгіянальных праектаў важна вызначыць суб’екты развіцця эканомікі тэрыторый, каб выпрацаваць і прапанаваць спосабы іх узаемадзеяння. Слухачам даецца разуменне таго, што ў цэлым суб’екты,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыё ўзаемадзеянне можа ажыццяўляцца праз фармат рэгіянальнага культурнага праекта і сацыяльнае партнёрства, падраздзяляюцца на дзве катэгорыі, якія можна ўмоўна вызначыць як «унутраная» і «знешняя». Да першай, «унутранай», катэгорыі ставяцца патэнцыйныя партнёры з рэгіёнаў і лакальных тэрыторый: прадстаўнікі органаў улады, адказных за рэалізацыю праграм развіцця рэгіёнаў і тэрыторый; кіраўнікі ўстаноў культуры рэгіянальнага і мясцовага узроўняў; кіраўнікі дзеючых лакальных і рэгіянальных праектаў, якія маюць патрэбу ў актывізацыі; прадстаўнікі мясцовага бізнесу; навучэнцы мясцовых устаноў адукацыі; мясцовыя супольнасці, тэматычна звязаныя з канкрэтнымі рэгіянальнымі рэсурсамі або аб'яднаныя патрэбнасцямі. Другая катэгорыя знешняя («вонкавая») — гэта патэнцыйныя партнёры звонку для мясцовых і рэгіянальных культурных і сацыякультурных праектаў: прафесійныя супольнасці, аб'яднанні, асацыяцыі, часта геаграфічна і сацыяльна аддаленыя ад месца рэалізацыі праекта, але патэнцыйна зацікаўленыя ў канкрэтных рэгіянальных рэсурсах, у тым ліку нематэрыяльных; бізнес-супольнасці, геаграфічна і сацыяльна аддаленыя ад месца рэалізацыі праекта, але арыентаваныя на сацыяльную адказнасць і актыўнасць; спецыялісты-эксперты; беларускае прадстаўніцтва замежных бізнес-структур і інстытуцый; прадстаўнікі недзяржаўнага сектара міжрэгіянальнага і рэспубліканскага ўзроўняў; установы адукацыі; інстытуцыі, адказныя за аналітыку і распрацоўкі ў сферы дзяржаўных стратэгій развіцця.

Такім чынам, слухачам важна ўсвядоміць, што названыя катэгорыі можна разглядаць і як патэнцыйных партнёраў рэгіянальных культурных праектаў, і як мэтавыя групы. У абодвух варыянтах узаемадзеяння неабходна вызначыць іх патрэбнасці. Практыка паказвае, што адной з асноўных з'яўляецца спецыфічная патрэбнасць быць залучанымі ў праекты, інтэгравальнае разнавектарнае сацыякультурнае партнёрства, перастаць адчуваць сваю ізаляцыю і аддаленасць. Далейшы ход метадычнай думкі акцэнтуецца на наступным: каб задаволіць гэтую патрэбнасць у «далучанасці», неабходна спачатку задаволіць патрэбнасць у інфармаванасці аб магчымасцях сацыяльнага партнёрства і тых бонусах, якія яно можа прынесці, аб канкрэтных механізмах узаемадзеяння з партнёрамі з іншых сектараў соцыуму і месцах сустрэчы з патэнцыйнымі партнёрамі і суб'ектамі ўзаемадзеяння, аб паспяховых прыкладах такога партнёрства ў Беларусі. Задавальненне патрэбнасцей у «далучнасці» і інфармаванасці цягне за сабой патрэбнасць у навучанні, набыцці кампетэнцый, неабходных для рэалізацыі паспяховага сацыякультурнага партнёрства і праектнай дзейнасці (навучанне павінна быць адаптаваным да рэалій). У сукупнасці ж вышэйпрыведзеныя патрэбнасці абумоўліваюць патрэбнасць у камунікатыўнай прасторы, найперш — фарматную і метадычную.

У сэнсе выніковага фарміравання адпаведных кампетэнцый слухачоў, не менш, а можа і больш важным з'яўляецца ўсведамленне таго, якія асаблівыя веды, кампетэнцыі, метады набывае беларускі «суб'ект развіцця тэрыторый» у рамках рэалізацыі рэгіянальнага культурнага праекта. І суб'ект-заяўнік, і суб'екты-партнёры набываюць у яго рамках шэраг неабходных для далейшага развіцця новых навыкаў і ведаў, асвойваюць базавыя метады, што з'яўляецца якасным скачком іх уласнага развіцця.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асаблівае месца пры рэалізацыі адукацыйных праграм па напрамку «Сацыякультурнае праектаванне», як адзначалася, удзяляецца аналізу канкрэтных прыкладаў рэалізацыі адпаведных канцэпцый. Так, адным з адметных напрамкаў практычнага сацыякультурнага праектавання з'яўляецца арганізацыя мастацкіх пленэраў і сімпозіумаў. Скульптурныя пленэры і сімпозіумы з'яўляюцца адной з самых відовішчных форм мастацкіх праектаў, а «пленэрызацыя» прасторы вакол устаноў культуры, асабліва ў рэгіёнах, становіцца часткай мясцовай стратэгіі развіцця населенага пункта.

Значэнне такога роду культурных праектаў абумоўлена тым, што ў апошні час узрасла цікавасць грамадства да мастацтва скульптуры. Гэты від мастацтва карыстаецца асаблівай увагай з прычыны свайго грамадскага характару, высокіх ідэйных і горадабудаўнічых задач. Скульптура — гэта сродак, здольны ператварыць любую прастору ў канкрэтную, падначаленую пэўнай ідэі, грамадска значную. Істотна ўзрасла актыўнасць мастакоў у гэтай галіне як у Беларусі, так і за яе межамі. Многія скульптары прадстаўляюць Беларусь на міжнародных скульптурных пленэрах.

Задачай скульптурнага пленэру з'яўляецца праца над стварэннем парку скульптуры. Сёння мы ведаем пра шэраг міжнародных праектаў, якія прывялі да стварэння вялікіх скульптурных паркаў, якія напоўнены творамі разнастайных кірункаў розных аўтараў. Геаграфія іх вельмі шырокая: сусветную вядомасць атрымалі скульптурныя паркі і сімпозіумы ў Кітаі, Бразіліі, Паўднёвай Карэі, Чэхіі, Турцыі, Швейцарыі, Расіі і многіх іншых краінах.

Гарадскія вуліцы і паркі — месцы, дзе жыхар усё яшчэ можа сутыкнуцца з мастацтвам. Звычайны парк у шматтысячным горадзе мае выключнае значэнне. «Парк скульптуры» і проста «парк» адрозніваюцца ў першую чаргу тым, што першы ўяўляе арганізаванае, напоўненае мастацтвам асяроддзе, стварае адчуванне псіхалагічнага камфорту, выконвае функцыю эстэтычнага, мастацкага выхавання, а другі — месца адпачынку. Гэтыя ўпадабаныя гараджанамі месцы прыцягваюць увагу турыстаў. Пры разумным планаванні, рэкламе, стварэнні адпаведнай інфраструктуры скульптурны парк можа стаць турыстычным цэнтрам, які актыўна развіваецца.

Геаграфія беларускіх скульптурных пленэраў пашыраецца з кожным годам — Магілёў, Гродна, Пінск, Смаргонь, Астравец, Салігорск, Лагойск, Жалудок і інш. Кіруючыя работнікі і спецыялісты сферы культуры дзякуючы ўключэнню тэматыкі «ўкаранення ландшафтна-паркавай скульптуры ў гарадское асяроддзе» ў змест адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі для кіраўнікоў і спецыялістаў упраўленняў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама, устаноў культуры Рэспублікі Беларусь павінны атрымліваць, перш за ўсё, практычныя рэкамендацыі з улікам сучасных патрабаванняў да правядзення скульптурных сімпозіумаў па каменю, міжнароднага і асабістага вопыту ўдзельнікаў аналагічных мерапрыемстваў, якія праводзяцца як у Беларусі, так і за яе межамі. Разам з гэтым, не менш багаты і каштоўны матэрыял даюць праекты, якія ажыццяўляюцца ў рэгіёнах. Яскравым прыкладам стаў скульптурны пленэр «Жалудок здзяйсняе мары», ажыццёўлены ў рамках сумеснай праграмы ЕС і ПРААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні».

Прыкладам адметнага рэгіянальнага культурнага праекта іншага роду можа служыць музей «Прастора Суціна» ў г.п. Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобласці. Калі да нядаўняга часу гэта быў прадукт праектнай ініцыятывы звонку, то зараз музей сам стварае крэатыўныя ідэі; вучыцца іх увасабляць у праектных заяўках; асвойвае працэс рэалізацыі праектаў — ад планавання, распрацоўкі канцэпцыі і папярэдніх кансультацый да справаздачнасці; удзельнічае ў сацыяльным і прафесійным партнёрстве на ўсіх стадыях рэалізацыі самастойнага праекта; прымяняе новыя праектныя фарматы; авалодвае прыёмамі кансалідацыі і стварэння ўласнага network, а таксама яго выкарыстання ў розных сектарах соцыуму; становіцца пляцоўкай камунікацыі для суб'ектаў развіцця дадзенай тэрыторыі, якая ахоплівае не толькі г.п. Смілавічы, але і Чэрвеньскі раён у цэлым.

У той жа час на занятках разам з пазітыўнымі прыкладамі выкарыстання культурных ініцыятыў і праектаў у фармаце ўзаемадзеяння суб'ектаў развіцця тэрыторый аналізуюцца праблемныя сітуацыі. Напрыклад, тыповай з'яўляецца сітуацыя, пры якой пасля першых поспехаў па рэалізацыі ініцыятыў на мясцовым узроўні (часцей за ўсё рэалізаваных з дапамогай розных грантавых праграм) наступае момант, калі неабходны якасны віток у развіцці, а ён не адбываецца. Факты сведчаць: у цэлым мясцовы рэцыпіент (ён жа суб'ект развіцця тэрыторый) застаецца пасіўным, механізм не запускаецца самастойна. Праект можа і далей бясконца паглынаць рэсурсныя ўліванні звонку, але спыняецца, як толькі яны спыняюцца. Прычына, як правіла, у тым, што з-за адсутнасці эфектыўных інтэгравальных механізмаў і методык, недастатковае развіццё атрымлівае міжсектарнае супрацоўніцтва.

Рэзюміруючым для слухачоў павышэння кваліфікацыі павінна стаць разуменне, што ў існуючых рэаліях рэгіянальнага развіцця праектныя фарматы прадстаўляюцца найбольш перспектыўнымі як інструмент інтэграцыі і навучання партнёрства. Для іх вывучэння і ўкаранення неабходна праводзіць навучанне праектнаму менеджменту. Таму пры распрацоўцы праграм павышэння кваліфікацыі ў Інбелкульце ўлічваюцца агульныя для ўсёй рэгіянальнай інфраструктуры Беларусі праблемы, сярод якіх, у тым ліку, недахоп у мясцовых кадраў вопыту і прафесійных менеджарскіх навыкаў у арганізацыі шматвектарнага сацыякультурнага партнёрства шляхам стварэння інтэгравальных ініцыятыў, а таксама неабходнасць атрымання прафесійнай экспертна-кансультацыйнай дапамогі ў рамках пазначанай праблематыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Готин, С.В.* Логико-структурный подход и его применение для анализа и планирования деятельности / С.В. Готин, В.П. Калоша. — М. : ООО «Вариант», 2007. — 118 с.
2. *Готин, В.В.* Модель IMACON : оценка замысла проектов, мониторинг, организационное развитие / В.В. Готин, В.В. Величко. — Вильнюс : UAB «Petro Ofsetas», 2013. — 132 с.
3. Инструментарий усиления жизнеспособности организации. — Szentendre, Hungary : Typonova, 2014. — 170 с.
4. Экспазіцыя ў музейнай прасторы : праектны менеджмент (Музейны сшытак) / укл., агульн. рэд. І. Б. Лапцёнак. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2012. — 100 с. : іл.